Жр 3202 07/207
Библиотека АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Слонімскага РК КП(б)Б.

№ 7 (208) чацвер, 30-га снежня 1943 г.

Прачытай і перадай другому.

## КАРОТКІЯ ВЕСТКІ.

—12-га снежня ў Маскве быў падпісан дагавор паміж Совецкім Саюзам і Чэха-Славацкай рэспубл. аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве.

—У Баўгарыі не спыняюцца дэманстрацыі насялення з дамаганнем міра.

—Ноччу 24-га снежня самалёты саюзнікаў скінулі на Берлін звыш 1.000 тон бомбаў. Цяпер 60 працантаў Берліна—гэта адны руіны. Звыш 1.300 амерыканскіх самалетаў зрабілі налёт на спецыяльныя ваенныя пабудовы ў раёне Па-дэ-кале.

## 25-ая ГАДАВІНА БССР.

Дзень 1-га студзеня 1944 г. з'яўляецца ДНЁМ 25-й гадавіны існавання БССР. У звязку з гэтым вялікім днём беларускага народа варта прыпомніць некатарыя гістарычныя праўды.

Комуністычная партыя большэвікоў, асабліва яе правадыры ЛЕНІН і СТАЛІН маюць найбольшыя заслугі ў будаванні беларускай дзяржаўнасці. З іх ініцыятывы была утворана Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка. Пры актыўнай дапамозе народаў Совецкага Саюза адбылося ў 1939 годзе доўгачаканае злучэнне земляў Беларусі ў адзінае цэлае.

У краіне лясоў, палёў і балот, у Беларускай рэспубліцы, разгарнулася запраўды гіганцкае будаўніцтва прамысловасці, гарадоў, чыгунак, аўтастрад і машынізацыя сельскай гаспадаркі. Краіна змяніла свой твар.

У БССР існавала шырокая сець узорных ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых школ у роднай мове на чале з Акадэміяй Навук. Совецкая ўлада вырасціла вялікі слой беларускай інтэлігенцыі, якая выйшла з народа і працавала для яго.

Агромны выпуск кніжак і газет, тэатры, кіно-фільмы, бібліятэкі, клубы, дамы адпачынку задавальнялі патрэбы мас.

Пры ўладзе польскіх паноў беларусы былі пазбаўлены ўсякага права.

Нямецкая-ж улада адабрала мірнае шчаслівае жыццё ў БССР, прынесла для народа мукі і смерць, разбурэнне гарадоў і вёсак.

Слонімшчына таксама адчула і адчувае крывавае панаванне немцаў. У канцы 1942 года, калі фронт быў далека, за межамі Беларусі, нямецкае ЗВЯР'Ё правяло жудасныя расправы над мірным жыхарствам весак Акунінаўскага сельсовета. У весцы Заводны Лес замучылі 209 чалавек, спалілі 110 двароў. У в. Акунінаа растралялі і спалілі жыўем 392 чалавекі, спалілі 98 двароў. У в. Баразікі забілі 111 чалавек, выгналі ў нямецкую катаргу 20 чалавек, спалілі 21 двор. Нямецкая рука не шчадзіла груднога дзіцяці, 90-гадовага старыка. Факты можна прыточваць да бесканечнасці, а вывад адзін: гітлероўская Нямеччына—самы большы і злейшы наш вораг. Беларусы павінны зрабіць УСЁ, што могуць, каб прыспешыць час вызвалення.

## Зімовы наступ распачаўся.

У палове снежня войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта перайшлі ў наступ паўднёвей гор. Невеля і прарвалі умацаваную лінію праціўніка шырыней на 80 км. Толькі за ПЕРШЫЯ 5 ДЗЁН наступу разгромлены 87, 129, 211 нямецкія пяхотныя дывізіі, 20-ая танкавая дывізія. Знішчана шмат танкаў, 154 гарматы, 123 мінамёты, 586 кулямётаў, 760 аўтамашын, 16 розных складаў. На полі боя асталіся забітымі 20 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў. Нашымі войскамі за 5 ДЗЁН захвачана 194 гарматы, 75 мінамётаў, 735 кулямётаў, больш 5000 аўтаматаў і вінтовак, 37 танкаў, 24 розныя склады, звыш 200 фурманак з розным грузам.

Ад 14-га да 28-га снежня войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта занялі звыш 1050 НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ, у тым ліку гор. ГАРАДОК, перарэзалі шасе і чыгунку ВІЦЕБСК—ПОЛАЦК.

Войскі 1-га Украінскага фронта пад камандай генерала арміі Ватуціна на днях таксама перайшлі ў наступ і ад 23-га да 29-га снежня уключна, занялі звыш 560 НАС. ПУНКТАЎ, у тым ліку гарады РАДОМЫШЛЬ, КОРЫСТЫШЭЎ, ЧЭРНЯХАЎ, гор. і чыг. вузел КОРАСЦЕНЬ і раённыя цэнтры ЖЫТОМІРСКАЙ обл.: БРУСІЛАЎ, КОРНІН, КАЦЕЛЬНЯ, АНДРУШЭЎКА, ВЧЭРАЙШЭ і ПОЦІЕЎКА. Толькі за першыя 3 дні немцы пакінулі на полі боя звыш 15 тыс. забітых салдат і афіцэраў. Здабыты вялікія трафеі, у тым ліку 14 розных складаў. Наступ прадаўжаецца.

## Падзеі ў Югаславіі.

У Югаславіі, на тэрыторыі вызваленай ад нямецкіх акупантаў, выбран часовы ўрад і парламент. Галавой ураду вызначан доктар Іван Рыбор. Галоўнакамандуючым югаслаўскай вызваленчай арміі назначан Іосіф Броз-Тіто, якому прысвоен ранг Маршала.

Аддзелы народна-вызваленчай арміі Югаславіі трымаюць ініцыятыву ў сваіх руках на ўсіх участках барацьбы з акупантамі. Падчас апошніх БАЁЎ у Чарнагорыі югаслаўскія партызаны нанеслі немцам агромныя страты. Захвачана 13 мінамётаў, 8 кулямётаў, 400 вінтовак, 57 тысяч патронаў, 15.000 гранат.

жр 3202



## „НАГАРОДА"



Бачыць Гітлер — справа дрэнна
З яго тэхнікай ваеннай,
Цягнікамі давялося
Ездзіць толькі пад адкосы.
Вось прыдумаў „нагароду"
Для ўсіх здраднікаў народа,
Каб вязлі на сваіх спінах
Гітлераўскую быдліну.

В. Двоеў.

## ВЫХАД.

У кабінеце галоўнай кватэры сам фюрэр і дучэ. Адольф сядзіць пры стале, галава апушчана ўніз. Цёмна-чырвоны чай даўно ўжо астыў, а фюрэр думае... Беніта пахаджае па пакоі хуткімі нэрвовымі крокамі. Раптам узрок яго астанавіўся на партрэце ўласнай асобы, дучэ прашыпеў: „Эмігрант"—а ў думцы дабавіў: „у няволі". Тым часам Гітлер падняў галаў і з захапленнем прамовіў:

—Я сазнаю, што нашае палажэнне крытычнае. Вера ў непераможнасць нашых армій знікла, пайшла ў забыццё. Неабходны яшчэ адзін укол і я рызыкну. Сцягну ўсе сілы на ўсходні фронт, згрупую іх на адным участку і нам удасца заняць пару гарадоў. Гэта будзе вялікая справа. У абліччы суровых іспытаў зімы мы накажам Еўропе, што мы здольны не толькі планова ачышчаць гарады, зарыгляўваць мясцовыя ўклінаванні, адбіваць атакі ворага, мы яшчэ здольны наступаць. Разумееш? —нават наступаць!—Пры апошніх словах Адольф рэзка махнуў рукой. Шклянка паляцела на падлогу з такім лоскатам, быццам эшалон пад адкос.

—А потым што? Ізноў „скарачаем", ізноў „астаўляем"? —пытаўся дучэ.—Цяпер я ў цябе ў гасцях, стаўся эмігрантам у тваёй геройскай Нямеччыне. А што будзе, калі мы „планова" пакінем Берлін і „зарыгляем мясцовыя ўламанні" над Рэйнам? Бадай не астанецца нам месца ў „новай Еўропе".

Кроплі поту выступілі на твары Адольфа. А Беніта гаварыў:

—Я цябе люблю, фюрэр, і ўважаю. Нам трэба падумаць аб больш грунтоўным выхадзе з палажэння. У цябе, Адольф, ёсць грамадзянская спецыяльнасць: ты-ж маляр ды не дрэнны. Вось мая рада. Зменім знешні выгляд, у кішэні возьмем фалшывыя пашпарты, а ў рукі—вядро, фарбы, пэндзаль і пачнем новае жыццё ў „новай Еўропе". Можа ўдасца.

Гітлер скрыгануў зубамі, цярпенне лопнула. Як звер кінуўся крышыць усё, што пападала пад рукі. Беніта пабялеў, як бумага; адкрыў рот і хацеў крыкнуць... Але ў гэты мамэнт задрыжалі, захадзілі сцены. Англа-амерыканскія самалёты разрушалі кварталы Берліну. Абодва правадыры пабеглі ў падзямелле.

Мікалай Філіпаў.

## Паляванне на немцаў.

Ужо некалькі гадзін сядзяць 2 партызаны-снайперы і не так далека ад іх яшчэ 2. Чакаюць паяўлення немцаў. Вось паказваецца фурманка — едуць 2 „фрыцы". „Ты бяры на мушку таго, а я—гэтага",—шэпча партызан. Падпускаюць блізка. Раздаюцца адначасна 2 выстралы. Адзін немец на месцы асунуўся мертвым, другі, ранены, —уцякае. Наступная куля кладзе яго. Партызаны быстра забіраюць трафеі і адыходзяць. Падобным способам смельчакі партызанскага атрада ім. Панамарэнка за кароткі час знішчылі 16 немцаў. Снайперскі спосаб палявання на немцаў стаў масавым з'явішчам у атрадзе і дае добрыя вынікі.

Камісар атрада Л-н.

## 2 узрывы - 99 вагонаў.

У пачатку гэтага месяца партызаны атрада „С.Б." выдатна ўзарвалі 2 паязды на адцінку чыгункі Слонім-Азярніца. Падчас аднаго ўзрыва знішчан паравоз і 29 вагонаў, падчас другога—паравоз і 70 ваг. Вялікая колькасць знішчаных вагонаў у другім выпадку аб'ясняецца тым, што эшалон меў 2 паравозы: адзін спераду, другі—ззаду. Калі пярэдні паравоз паляцеў з адкосу і пацягнуў за сабою вагоны, то задні—спіхаў іх. Такім чынам двума ўзрывамі знішчана 99 вагонаў з жывою сілаю, танкамі, самаходамі, гарматамі, соллю, дражджамі і іншымі прадуктамі.

Партызан.

x x x

## Быўшыя паліцыянты помсцяць акупанту.

Партызаны атрада „С. Б." нарваліся пры шасе Слонім — Ражана на нямецкую засаду. Завязаўся бой. На дапамогу ворагу надышлі 2 танкеткі і аўтамашыны з немцамі і паліцыяй. Бой трываў. Нарэшце партызаны адступілі. У выніку боя забіта 4 і ранена 6 немцаў. У баю адзначыліся партызаны - кулямётчыкі, яшчэ нядаўна быўшыя паліцыянты.

М-ч.

Рэдкалегія.